ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

РЭЦЭНЗІІ

REVIEWS

https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-125-128

Паступіў у рэдакцыю 03.08.2021
Received 03.08.2021

А. У. Бразгуноў

Pwglj ^Zke_^Z\Zggy† [_eZjmkdZc dmevlmju fh\u • e•lZjZlmju GZpuygZevg
F•gkd ;_eZjmkv

«ОТКРЫВАЮЩИЙ ВРАТА УЧЕНОСТИ»: НОВАЯ КНІГА ПРА СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА

З’яўленне кнігі – заўсёды свята, перш за ўсё для розуму, і асабліва ў выпадку навуковай працы. Кніга, якая не выклікае зваротнай рэакцыі ад чытача, напісана дарэмна. (Хаця ў сучасным свеце, які адмаўляе многія выпрацаваныя стагоддзямі ісціны, падобныя развагі могуць быць інтэрпрэтаваны як «ерась».) Навуковая праца можа быць каштоўнай і цікавай пры ўмове, што нясе новую інфармацыю, новыя веды. Але, да таго ж, і пакідае чытачу магчымасць адчуць асабістую рэфлексію з нагоды прачытанага. Новае даследаванне Лолы Уткіраўны Званаровай (Звонарёва Л. У. Открывающий врата учености: жизнь и творчество Симеона Полоцкого / монография. Отечественная история. – М. : Academia, Библио ТВ, 2020. – 400 с.) як мага найлепш адпавядае вышэйназваным крытэрыям.

Чытач, які, зыходзячы з назвы манаграфіі, спадзяецца на традыцыйнае выкладанне матэрыялу, – апісанне этапаў жыццёвага шляху асветніка, узбагачанага выкладам зместу і сэнсу яго твораў, – будзе падмануты ў сваіх чаканнях. Але падмануты ў станоўчым, калі так магчыма сказаць, сэнсе слова. У «Предисловии: 40 лет спустя» аўтар з асаблівай цеплынёй і ўдзячнасцю да людзей, якія прынялі ўдзел у яе навуковым лёсе, згадвае час свайго навучання ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце, у аспірантуры Інстытута літаратуры АН БССР, а таксама этапы свайго станаўлення як вучонага – даследчыка жыцця і творчасці Сімяона Полацкага, найярчэйшай творчай асобы ўсходнеславянскай айкумены. Задача, якую ставіць перад сабой даследчыца, – разгледзець феномен Сімяона Полацкага «на фоне складаных расійска-польска-беларуска-ўкраінскіх культурных і палітычных узаемасувязей і ўзаемаўплываў» (с. 41) – не з лёгкіх.

У цэнтры даследавання, вядома, знаходзіцца асоба Сімяона Полацкага. Але разам з тым яно арыентавана таксама і на спасціжэнне прычын і абставін паступовых, не заўсёды ўстойлівых змен у дзяржаўным, рэлігійным, культурным і грамадскім жыцці Маскоўскай дзяржавы другой паловы XVII ст. Змен, ідэйным натхняльнікам многіх з якіх стаў Сімяон Полацкі, змен, што набылі незваротны характар у час царавання Пятра I і ператварылі Маскоўскую дзяржаву ў Расійскую імперыю. Таму падзел асноўнай часткі даследавання на тры раздзелы, прысвечаныя адпаведна ідэйнаму, тэалагічнаму і педагагічнаму ўкладу асветніка ў развіццё рускай культуры, бачыцца цалкам дарэчным.

Хаця сцверджанне, што Сімяон Полацкі – знакавая для культуры і гісторыі ўсходніх славян асоба, даўно стала агульнапрызнаным, тым не менш яно захоўвае сваю актуальнасць. Знакавасць у многім вынікае з факталогіі жыццёвай і творчай біяграфіі пісьменніка: навучанне ў Кіеве і Вільні, выкладчыцкая і асветніцкая дзейнасць у Полацку і Маскве. Ды не толькі ў факталогіі справа. Не меншае, а можа, і вырашальнае значэнне мелі практычныя пачынанні і ідэйныя задумы асветніка.

У гэтай сувязі характэрная назва першага раздзела даследавання – «Политическая позиция просветителя как результат осмысления опыта всеобщей и европейской истории». Тут

© Бразгуноў А. У., 2022